тракт
№ 2 (346)

Храмы маёй радзімы

*Царква св. благаверных Пятра і Фяўроніі*
*г. Пінск*

# Прыцягальная сіла

**Бывае, кальне ў сэрцы дакор, калі зразумееш, што нешта згубіў, кудысьці спазніўся, штосьці прамінуў, і гэтага якраз так не хапала доўгія гады. І калі раптам тое нешта знаходзіш, то перажываеш бурлівую радасць сустрэчы...**

Такую моцную радасць перажыла і я, калі ўпершыню пераступіла вароты храма-шатра, названага ў гонар святых благаверных князёў мурамскіх Пятра і Фяўроніі. Чуткі аб тым, што на ўзлеску каля горада Пінска, у новым мікрараёне «Вясёлкавы», пачалося будаўніцтва яшчэ адной царквы, мяне толькі радавалі. Але наведаць новабудоўлю не ўяўляла цікавасці: яна не адзіная ў горадзе. Я ў той час была прыхаджанкай Свята-Варварынскай царквы і была ўпэўнена, што ёй не здраджу. Толькі жыццё непрадказальнае. Памянялася маё месца жыхарства, храм-шацёр аказаўся бліжэй. Пра яго даўно ішлі захапляльныя водгукі. Дзеля цікавасці я вырашыла, што ў найбліжэйшы выхадны зраблю туды экскурсію. І чым бліжэй падыходзіла, тым глыбей пераконвалася: такое нязвыклае для храма відовішча перад вачыма, што накрывала гарачая хваля здзіўлення і захаплення. У сэрцы запёк дакор аб тым, што я спазнілася. І спазнілася, як высветлілася, на чатыры з паловай года.



## Працяг гісторыі

Дзякуючы распачатым службам і ахвяраванням прыхаджан мала-памалу папаўнялася царкоўная казна. І ва ўсім малітоўна звяртаючыся да ласкі Бога і просячы благаслаўлення Уладыкі, настаяцель Аляксандр стаў актыўна дзейнічаць. Цікавая ідэя шатра нарадзілася ў бацюшкі падчас паездак. Праўда, з назвай храма на той момант не вызначыліся: Уладыка прапаноўваў — Святатроіцкі, але людзі прасілі святых заступнікаў сям'і — Пятра і Фяўроніі: у новых

як многія збянтэжана і, магчыма, упершыню ў жыцці спрабуюць скласці пальцы рукі ў трохперсце і паднесці да лба.

Карэктывы, на жаль, нечакана ўнёс 2020 год, перацягнуў цяжар і ў наступны, 2021-ы. Запаланіў ковід, прымусіў прыстасоўвацца да новых абставін: былі адменены ўсе масавыя мерапрыемствы.

Кожны чалавек усё сваё жыццё спадзяецца на божую літасць — дапамогай тым, хто меў патрэбу ў спачуванні і суперажыванні. У храме-шатры былі праведзены дабрачынныя кірмашы «Дапамога пінскім медыкам». Міма не прайшоў ніхто: хто аказаў грашовую дапамогу, а хто забяспечыў патрэбным матэрыялам. І год таму пад скляпеннямі храма спантанна створаны рукадзельніцамі і майстрыхамі клуб «Прыхаджаначка»: заўзята, на хаду асвойвалі новую прафесію швачкі. Выкройвалі і шылі са спанбонду ахоўныя касцюмы. Заставаліся нават у начную змену. І з красавіка да чэрвеня 2020 года ў гарадскія бальніцы і паліклінікі было перададзена 115 літраў антысептыку, больш за 150 камбінезонаў, 82 халаты, 4 тысячы масак, бахілы, шапачкі, нарукаўнікі. Частка сабраных грошай на дабрачынным кірмашы «Пабудуем храм разам» была перададзена пінскім медыкам.

Хай пандэмія прыціхла, клуб «Прыхаджаначкі» яшчэ больш згуртаваўся, развівае сваю дзей-

кірмаш з продажам выпечкі на пачатак збору сродкаў на праектны каштарыс пад будаўніцтва. Нават падчас пандэміі нераўнадушныя прыхаджане не пажадалі чакаць лепшых часоў, неслі паслушэнства, збіраючы сродкі не толькі ў горадзе і сваім раёне, але і па суседніх. І ў лютым 2021 года адбылася прэзентацыя праекта новага храма. Закупілі метал на купал, за работу ўзяліся майстры.

У ноч з 21 на 22 чэрвеня 2022 года, у Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, моладзь Пінскай епархіі збіралася на акцыю «Дарогамі памяці». Злёт пачаўся з экскурсіі ў этнаграфічны музей у вёску Бабровічы Івацэвіцкага благачыння. Там з нецярпеннем шосты год запар чакаў сустрэчы з моладдзю пісьменнік, краязнаўца і этнограф Веніямін Мікалаевіч Бычкоўскі, ураджэнец Уфы, які ў сярэдзіне 90-х пасяліўся ў Бабровічах. І, вывучыўшы гісторыю палескага краю, стварыў на сваёй сядзібе этнаграфічны музей, храм-помнік святой Параскевы Пятніцы. У храме на мармуровай дошцы 1280 імёнаў бязвінна забітых жыхароў чатырох вёсак. Звінелі званы храма-помніка, своеасаблівай «свечкай памяці» стала супольная малітва за літургіяй, якую ўзначаліў кіраўнік маладзёжнага аддзела Пінскай епархіі, настаяцель храма святых благаверных князёў Пятра і Фяўроніі іерэй Аляксандр Сыцэвіч. На

**У храме на мармуровай дошцы 1280 імёнаў бязвінна забітых жыхароў чатырох вёсак. Звінелі званы храма-помніка, своеасаблівай «свечкай памяці» стала супольная малітва за літургіяй, якую ўзначаліў кіраўнік маладзёжнага аддзела Пінскай епархіі, настаяцель храма святых благаверных князёў Пятра і Фяўроніі іерэй Аляксандр Сыцэвіч. На сумеснай малітве**

аб тым, што я спазнілася. І спазнілася, як высветлілася, на чатыры з паловай года.

**Кожны чалавек усё сваё жыццё спадзяецца на божую літасць — дапамогай тым, хто меў патрэбу ў спачуванні і суперажыванні. У храме-шатры былі праведзены дабрачынныя кірмашы «Дапамога пінскім медыкам».**

## Пачатак гісторыі

Былы выпускнік Мінскай духоўнай семінарыі Аляксандр Аляксандравіч Сыцэвіч ужо шосты год служыў дыяканам у епархіі Уваскрасення Славушчага каля Уладыкі Пінскага і Лунінецкага Стэфана. Аднойчы, у 2013 годзе, Уладыка прапанаваў Аляксандру зарэгістраваць сваю абшчыну, назначыў старшынёй прыходскага савета. І, акрылены прызначэннем, наваяўлены старшыня заняўся зборам дакументацыі для ўзвядзення храма, у якім у хуткім часе атрымаў пасаду настаяцеля. Доўга шукалася месца, пакуль тагачасны архітэктар не прапанавала заняць край узлеску каля новага мікрараёна «Вясёлкавы», які хутка рос. Нязручным выбранае месца не падалося, хоць і было завалена смеццем. Наадварот, спадабалася, бо ў эрудзіраванага бацюшкі адразу пачалі нараджацца далёкабягучыя, смелыя планы наконт упарадкавання тэрыторыі. І 20 мая 2014 года, у дзень памяці з'яўлення іконы Божай Маці «Жыровіцкая», была нацягнута палатка, а на другі дзень, 21 мая, на свята Іаана Багаслова, узнеслася да неба першая літургія. Гэтая дата стала днём адліку існавання новага храма.

прапаноўваў — Святатроіцкі, але людзі прасілі святых заступнікаў сям'і — Пятра і Фяўроніі: у новыя кватэры засяляліся маладыя сем'і, дзе лад і згода — самае галоўнае. На тым і пагадзіліся.

Летам 2018 года адбылося ўрачыстае адкрыццё варкаўт-пляцоўкі — месца для заняткаў на турніках для ўсіх, хто любіць спорт; насыпана высокая горка для катання зімой на лядзянках. Пляцоўка ніколі не пустуе. Яе выкарыстоўваюць для правядзення гульняў і спаборніцтваў на Святкі ўзімку, летам ладзяцца канцэрты, пастаўленыя як сваімі сіламі, так і запрошанымі гасцямі. Па божым промысле летам 2017 года быў пакладзены пачатак добрай традыцыі. У дзень Святой Тройцы — свята нараджэння праваслаўнай царквы на зямлі — упершыню ў гісторыі духавенства Беларусі быў праведзены Траецкі баль, наладжаны сіламі навучэнцаў і ўсіх ахвотных. На вялікую пляцоўку пад адкрытым небам выйшлі неверагодна прыгожыя пары, і загучала бессмяротная музыка Шапэна, Чайкоўскага, Штрауса, Гендэля.

Самога бацюшку Аляксандра хлапчанём прывяла ў храм яго мама, прыхаджанка Свята-Варварынскай царквы, Святлана Казіміраўна. І, ад якога часу сябе памятае, ён заўжды наведваў царкву. З васьмігадовага ўзросту Саша пачаў прыслужваць каля бацюшкі. Гэта і прадвызначыла яго лёс: без служэння Богу не ўяўляў будучыні. А каб абараніць свой выбар ад кпінаў равеснікаў — запісаўся ў секцыю рукапашнага бою. Ці не адсюль з'явіліся спартыў-

**благаверных князёў Пятра і Фяўроніі іерэй Аляксандр Сыцэвіч. На сумеснай малітве прысутнічала больш за сто чалавек з Баранавіцкага, Ляхавіцкага і Пінскага благачынняў.**

ныя пляцоўкі дзецям? Яшчэ студэнтам Аляксандр ажаніўся. Яго абраннікай стала прыгожая дзяўчына Ганна, студэнтка рэгенцкага вучылішча. Сябравалі яны са школьных гадоў, абое ўраджэнцы Пінска. Сёння ў сям'і Сыцэвічаў шасцёра дзяцей.

## Завяршэнне гісторыі

Насычаным на падзеі аказаўся 2018 год. Пры храме святых благаверных князёў упершыню на тэрыторыі Пінскай епархіі адбыўся V Усебеларускі злёт праваслаўнай моладзі за здаровы лад жыцця. Чатырохдзённая праграма з начлегам каля кастра і спевамі пад гітару падарыла моладзі пачуццё еднасці. Па словах настаяцеля, правядзенне злётаў падлеткам толькі на карысць, бо бачыш,

Хай пандэмія прыціхла, клуб «Прыхаджаначкі» яшчэ больш згуртаваўся, развівае сваю дзейнасць у розных напрамках.

Адбыўся і чаканы, урэшце, выязны падлеткавы VIII з'езд «Праваслаўная моладзь за здаровы лад жыцця» ў горадзе Століне. З апошняй дэкады студзеня 2022 года ў прыходзе храма знаходзіліся святыні з Грузіі: абразы і мошчы святых прападобных Гаўрыіла Самтаўрыйскага і Серафіма Сароўскага, а таксама каўчэг з часціцамі мантыі і скуфы прападобнага Гаўрыіла Ургэбадзэ.

Пабудаваць дом — адзін са складнікаў чалавечага шчасця. «Узвёўшы найлепшую з пабудоў — храм Божы, людзі пакінуць пра сябе вечную памяць на зямлі!» — так сцвярджаюць мудрыя старцы.

Даўно выношвалася і выспявала задумка аб пабудове новага малога храма святых благаверных князёў мурамскіх Пятра і Фяўроніі, з якой пазней падзяліўся айцец Аляксандр. Яго з паразуменнем падтрымалі прыхаджане. І з гэтай нагоды праводзіўся дабрачынны

епархіі, настаяцель храма святых благаверных князёў Пятра і Фяўроніі іерэй Аляксандр Сыцэвіч. На сумеснай малітве прысутнічала больш за сто чалавек з Баранавіцкага, Ляхавіцкага і Пінскага благачынняў. Да ўдзельнікаў злёту сваім спевам далучыліся і студэнты Мінскай духоўнай семінарыі. У пропаведзі айцец Аляксандр адзначыў, што сумесная малітва і зносіны дапамагаюць развіваць пачуццё любові да Бога, роднага краю і адзін да аднаго.

## А што ў будучыні?

21 мая 2022 года адзначалася васьмігоддзе ад першай праведзенай службы храма.

У чароўным лясным асяроддзі плануецца ўзвесці храм святых благаверных князёў мурамскіх Пятра і Фяўроніі. І ўсе цяперашнія намеры і намаганні прыбліжаюць да жаданай мары. А ва ўпадабаным прыхаджанамі храме-шатры застануцца мошчы блажэннай Матроны.

З вялікім нецярпеннем чакаюць прыхаджане (і не толькі яны) аднаўлення Траецкага балю, канцэртаў на летняй пляцоўцы. І шмат чаго яшчэ з таго, што падкажа само жыццё. Хочацца верыць, што 2023 год дасць старт у апраўданне людскім спадзяванням.

Закончыць свой аповед хочацца словамі архімандрыта Рафаіла (Карэліна): «Не аддзяляйцеся ад храма, які б негатыў не ўбачылі ў людзях, наведвальніках царквы і нават служачых у ёй. Усё гэта абалонка, а сутнасць Царквы — жыватворная, нябачная сіла Госпада, без якой няма ні вечнага ўратавання, ні супакою душы на зямлі»...



**Галіна ЛАЗІЦКАЯ.**